ДЗЯРЖАЎНАЯ УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА №16 Г. БАРЫСАВА ІМЯ І.У. БАРЫСЮКА”

# З ЛЮБОЎЮ І АДДАНАСЦЮ

Зімін Аляксей Мікалаевіч
вучань 9 “Б” класа
Тэл. 94-06-83
Кіраўнік
Асіпенка Надзея Іванаўна
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
Тэл. 8 (029) 263-57-54




З любоўю і адданасцю

Па прызванні і любові да дзяцей Кацярына Аляксандраўна Кукушкіна стала настаўнікам рускай мовы і літаратуры. Яна больш сарака гадоў свайго жыцця прысвяціла нялёгкай справе выхавання падрастаючага пакалення.У Барысаў Кацярына Аляксандраўна прыехала ў далёкім 1951 годзе і пайшла выкладаць рускую мову і літаратуру ў сярэднюю школу №16 г.Барысава, была нязменным завучам. За сваю адданую і творчую працу тут жа атрымала ганаровыя званні "Выдатнік народнай асветы","Заслужаны настаўнік БССР".

У нашай школе добра памятаюць яе настаўнікі, былыя выпускнікі і цяперашнія навучэнцы. Асабліва любіў успамінаць Кацярыну Аляксандраўну былы дырэктар Святаслаў Фёдаравіч Прахарэнка:

- Кацярына Аляксандраўна была настаўнікам добрасумленным, адукаваным, патрабавальным. Яна вучыла дзяцей самастойна мысліць і разважаць. Вучыла жыццю.А яшчэ гаварыў, што ў такой малой жанчыны на ўроках жалезная дысцыпліна (Кацярына Аляксандраўна была маленькага росту).

У яе вучыліся настаўнікі. Адна з настаўніц пабывала на 102 уроках і атрымала не толькі метадычную, але і чалавечую падтрымку. Да яе на ўрокі ішлі калегі вучыцца ўменню быць настаўнікам, завучам, уменню сказаць праўду і не пакрыўдзіць, не прынізіць. У Кацярыны Аляксандраўны вучыліся як прывіць цікавасць і любоў да свайго прадмета.

Ведалі Кацярыну Кукушкіну і ў іншых школах горада Барысава як метадыста, як актыўнага ўдзельніка ў грамадскім жыцці. Яна аказвала вялікую дапамогу маладым спецыялістам у пытаннях народнай асветы. Кацярына Аляксандраўна двойчы ездзіла ў ГДР выкладчыкам на курсы ўдасканалення настаўнікаў – немцаў, якія выкладалі рускую мову ў сваіх школах.

Калі калегі пыталіся, як ёй удавалася прывіць цікавасць і любоў да свайго прадмета,то яна сціпла адказвала, што гэта атрымліваецца не адразу,патрэбны гады, галоўнае – неабходна развіваць уласнае меркаванне і ні ў якім разе нельга абрываць думкі вучняў, а трэба даць магчымасць выказацца да канца.

У нашым краязнаўчым музеі ў шостай зале размешчана фатаграфія Кацярыны Кукушкінай – мілавідны, з настойлівым поглядам твар. Побач пасведчанні заслужанага настаўніка БССР, выдатніка асветы, а яшчэ – пісьмы яе вучняў.

Кацярына Аляксандраўна мела высокі ўзровень педмайстэрства, сярод калег карысталася заслужаным аўтарытэтам.

44 гады прысвяціла працы настаўнікам і завучам у сярэдняй школе №16 г.Барысава, “Заслужаны настаўнік БССР”, ”Выдатнік народнай асветы”, завуч школы Кукушкіна Кацярына Аляксандраўна.

У 2009 годзе яна пакінула гэты свет назаўсёды…Але на доўгія гады засталася ў памяці калег роднай школы.

У 2010 годзе па рашэнні педсавета Дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа №16 г.Барысава” ад 16 снежня 2010, пратакол №4 распрацавана палажэнне аб прысуджэнні прэміі імя Кукушкінай К.А. педагогам школы за выдатныя заслугі ў працы. І ўпершыню, у 2010 годзе, у год 60-годдзя школы ўладальнікам гэтай прэміі стала настаўнік інфарматыкі Чагарава Я.М., а ў 2015 годзе – настаўнік працоўнага навучання Чацвяракова Н.У., у снежні 2019 года – нстаўнік інфарматыкі Бяляева Н. Д.

Прафесіянальная прэмія імя Кацярыны Аляксандраўны Кукушкінай – гэта ПАМЯЦЬ аб таленавітым настаўніку, цудоўным чалавеку.



ПРЕМИЯ
ИМЕНИ
Е.А.КУКУШКИНОЙ

44 года ежедневной кропотливой работы замечательных открытий посвятила нашей школе «Заслуженный учитель БССР», «Отличник народного образования» завуч школы **Кукушкина Екатерина Александровна).**

Кукушкина Екатерина Александровна (1927 - 2009 гг.) "Отличник народного образования" (1956 г.) "Заслуженный учитель БССР" (1966 г.)

Впервые, в 2010 году, в год 60-летия школы №16 была учреждена премия имени Е.А.Кукушкиной. Первым обладателем этой премии стала учитель информатики **Чагарова Е.Н.**

РЕЗУЛЬТАТЫ УЧАСТИЯ В ОЛИМПИАДАХ, КОНФЕРЕНЦИЯХ
*ПО ИНФОРМАТИКЕ* 2005-2010 годы

| Учебный год | Вид | Уровень | Результат |
|---|---|---|---|
| 2005/2006 | Олимпиада | Район | Д - 1, Д - 1, Д - 1 |
| | | Область | Д - 2 |
| 2006/2007 | Конференция | Район | Д - 1 |
| | | Область | Д - 1 |
| | | Республика | Д - 1 |
| | Областной конкурс «Компьютер. Образование. Интернет» | | Д - 2 |
| 2007/2008 | Олимпиада | Район | Д – 1, Д - 1, Д - 2 |
| | | Область | Д - 2, Д - 3, Д - 3 |
| | Конференция | Район | Д - 1 |
| | | Область | Похвальный отзыв |
| 2008/2009 | Олимпиада | Район | Д – 1, Д - 3 |
| | | Область | Д - 3, Д - 3 |
| | Конференция | Район | Д - 1 |
| | | Область | Д - 1 |
| | | Республика | Д - 2 |
| | | Международный | Диплом участника |
| | V Балтийский научно-инженерный международный конкурс | | Д - 3 |
| 2009/2010 | Олимпиада | Район | Д – 1, Д - 1, Д - 2 |
| | | Область | Д - 3 |
| | Конференция | Район | Д – 1, Д - 3 |
| | | Область | Д - 1 |
| | | Республика | Д - 2 |
| | VI Балтийский научно-инженерный международный конкурс | | Лауреат конкурса |
| 2010/2011 | Олимпиада | Район | Д - 1, Д - 3 |



СЕРТИФИКАТ
на получение
ПРЕМИИ
им. Е.А.Кукушкиной

*за высокие результаты в образовательной деятельности, за личный вклад в повышение имиджа школы в системе образования*

**Четверякова Наталья Владимировна**

**учитель обслуживающего труда Государственного учреждения образования «Средняя школа №16 г.Борисова»**

**Директор учреждения** **А.А.Сергожко**

**2015**